чынам, дзякуючы прыметнікам са значэннем ацэнкі – характарыстыкі, параўнанні ў беларускіх народных песнях вызначаюцца трапнасцю, змястоўнасцю, глыбінёй.

Нярэдка паэтычная формула параўнання ў песнях выражаецца экспрэсіўным прыметнікам і назоўнікам у творным склоне: Вулічкай ішла (Аксіначка) цёмненькай хмарачкай. І к двору прыйшла дробненькім дожджыкам, па двору прайшла ясненькай зорачкай, У сені вайшла шэранькай вутачкай, У хату вайшла сізенькай павачкай, За стол села Злічненькай панначкай (ВП, IV. – с. 156). Бяззлучнікавая форма параўнання, або творны параўнання, узмацняе экспрэсіўнасць радка, надае яму энергічны рытм.

Рэдкасныя ў беларускіх народных песнях «адмоўныя параўнанні», у склад якіх уваходзяць прыметнікі з эмацыянальна-ацэначнымі фармантамі. Па сваёй будове яны нагадваюць паралелізм, першы кампанент якога апісальны (гэта – вобраз, які падаецца з адмоўем). Апавядальнік як бы папярэджвае: не пра гэта будзе ісці гаворка: Ды не трэскі ляцяць, не бяленькія, Ды твае дзеткі драбненькія (Б, І. – с. 206).

Першы радок у такім параўнанні настройвае слухача на пэўны лад, засяроджвае ўвагу на пэўным прадмеце, выклікаючы тым самым зацікаўленасць. У адмоўным параўнанні супастаўленне адбываецца праз адмаўленне (супрацьпастаўленне). Прыметнікі-эпітэты (бяленькія, драбненькія) у складзе такога параўнання ствараюць вобраз глыбокай эстэтычнай вартасці, забяспечваюць экспрэсіўнасць выкладу ўсяго твора. Б.В. Тамяшэўскі сцвярджае, што за межамі славянскай народнай паэзіі такі троп, як "адмоўнае параўнанне" не сустракаецца [2, с. 207].

Падагульняючы, адзначым, што выкарыстанне параўнанняў розных структурна-граматычных тыпаў у мове беларускіх народных песень заўсёды апраўдана. Экспрэсіўныя прыметнікі з'яўляюцца апорным кампанентам гэтага вобразнага сродку: яны забяспечваюць і сэнсавую, і эмацыянальную характарыстыку дзейных асоб / вобразаў, а таксама ствараюць глыбокі падтэкст песеннага радка, агульны эмацыянальны фон твораў.

Умоўныя скарачэнні:

Б, І – Балады /Уклад. Л.М. Салавей, кн. І. – Мн., 1977.
Б, ІІ – Балады /Уклад. Л.М. Салавей, кн. І. – Мн., 1978.
ВП, ІІ – Вяселле. Песні / Склад. Л.А. Малаш, кн. ІІ. – Мн., 1981.
ВП, IV – Вяселле. Песні / Склад. Л.А. Малаш, кн. IV. – Мн., 1985.
ВТП – Восеньскія і талочныя песні / Склад. А.С. Ліс. – Мн., 1981.
Жн. п. – Жніўныя песні /Уклад. А.С. Ліса. – Мн., 1974.
КПП – Купальскія і пятроўскія песні / Уклад. А.С. Ліса, С.Т. Асташэвіч. – Мн., 1985.
РП – Радзінная паэзія /Уклад. М.Я. Грынблата. – Мн., 1971.
С-Б – Сямейна-бытавыя песні /Склад. І.К. Цішчанка. – Мн., 1984.
СММ – Зянько У. Спадчына маёй маці / Уклад. В. Ліцвінкі. – Мн., 1993.

Спіс літаратуры:

1. Гілевіч, Н.С. Наша родная песня : навукова-папулярны нарыс / Гілевіч Н.С. – Мінск, 1968.
2. Томашевский, Б.В. Стилистика / Томашевский Б.В. – 2-е изд., испр. и доп. – Л., 1983.
3. Янкоўскі, Ф.М. Беларускія народныя параўнанні : кароткі слоўнік / Янкоўскі Ф.М. – Мінск, 1973.

*Наталля Петухова*

## ЭСТЭТЫКА-ВЫХАВАЎЧЫ ЎПЛЫЎ НАРОДНАЙ ПЕСНІ НА АСОБУ ДЗІЦЯЦІ Ў ПРАЦЭСЕ ДЗЕЙНАСЦІ ФАЛЬКЛОРНАГА ГУРТА

З глыбокай даўніны ў народзе ўсталявалася своеасаблівая сістэма выхавання дзяцей, якая знайшла сваё адлюстраванне ў фальклоры. Кожны з жанраў народнай творчасці ў нейкай ступені выражае погляды народа на выхаванне дзяцей, яго мары і надзеі, маральна-этычныя і эстэтычныя ідэалы, жыццёвы вопыт, адносіны да дабра і зла. Фальклорная спадчына Беларусі вельмі разнастайная, і кантакт сучасных дзяцей з народным мастацтвам аказвае станоўчы ўплыў на фарміраванне іх духоўнасці.

Працэс выхавання ў мінулым пачынаўся ад нараджэння дзіцяці. Свае першыя эстэтычныя ўражанні дзеці атрымлівалі з матчыных калыханак. Потым працэс выхавання працягвалі забаўлянкі, лічылкі, дражнілкі, гульні, загадкі, прыказкі, прымаўкі, песні, паданні, легенды, казкі, святы, абрады. Засваенне «фальклорнай спадчыны ішло паэтапна, у адпаведнасці з народным разуменнем сувязі паміж функцыянальным і структурным узростам дзіцяці» [6, с. 3]. «Ініцыятарамі» па сацыялізацыі і інкультурацыі дзяцей у традыцыйным асяроддзі з'яўляліся бацькі, старэйшыя сваякі, сябры і грамада. У сучасных умовах механізмы «натуральнай» перадачы традыцыі амаль што згублены і вядучая роля арганізатараў дзейнасці па этнакультурным выхаванні зараз належыць установам культуры і адукацыі.

Самы прадуктыўны спосаб далучэння дзяцей да народных традыцый – гэта развучванне з імі гульняў і побытавых танцаў, расповеды казак, спевы народных песень і ўдзел у каляндарных абрадах. Звычайна такая праца найбольш пасяхова адбываецца ў фальклорных калектывах (мал.1). Менавіта там многія дзеці ўпершыню пачынаюць знаёміцца з мастацкімі творамі фальклору (у большасці з песнямі).



*Малюнак 1* – Фальклорныя калектывы «Верас» (педагог-лідэр Т. Пладунова)
і «Калыханка» (педагог-лідэр Л. Рыжкова)

Народная песня прываблівае ўсіх нас сваёй эмацыйнасцю, разнастайнасцю сюжэтаў, вобразаў. У ёй знайшлі сваё адлюстраванне і родная прырода, і бацькава хата, і шчыры свет кахання. Гэта своеасаблівая «форма жыцця народа, у якой праяўляецца яго духоўная і матэрыяльная культура» [1, с. 3].

Фальклор – гэта форма навучання асновам філасофіі, любові да прыроды, правілам пабудовы грамадства і асновам жыцця ў ім. У сучаснасці, функцыі фальклору, у тым ліку і народнай песні, значна змяніліся. Калі ў старажытнасці галоўнай з'яўлялася функцыя адаптацыі чалавека да прыроды з мэтай уздзеяння на яе, то зараз – педагагічная, эстэтычная. Такім чынам, этнакультурнае выхаванне немагчыма без сувязі з народнай педагогікай. «Многія прынцыпы народнай педагогікі рэалізуюцца ў фальклоры.. уяўляючы сабой светапоглядную сістэму, фальклор нясе адпаведныя звышзадачы і стварае перадпасылкі для розных дысцыплін, у тым ліку, і педагогікі» [3, с. 369].

Педагагічныя функцыі народнай творчасці:

- ✓ далучэнне дзяцей да культуры грамадства. Сацыялізацыя і інкультурацыя.
- ✓ Развіццё творчага патэнцыялу чалавека, фарміраванне яго эстэтычных поглядаў.
- ✓ Набліжэнне чалавека да прыроды (экалагічнае выхаванне).
- ✓ Фарміраванне маральнага пачатку.
- ✓ Фізічнае развіццё дзіцяці.
- ✓ Патрыятычнае выхаванне.

На **эстэтычную свядомасць** беларускага народа паўплывалі прыродна-геаграфічныя ўмовы. «Назіраючы за прыродай, чалавек вучыўся мэтанакіраванасці і гармоніі. Паслядоўнае чаргаванне часін года, сезонныя змены прыроды, пераход яркіх летніх і асенніх колераў у строгія і спакойныя адценні зімы, у пяшчотную пастэль вясны развіваюць эстэтычныя пачуцці і густ» [2, с. 72]. Прыгажосць у прыродзе – гэта жыццё. Яна заўсёды юная, моцная, маляўнічая, яна дорыць чалавеку шчаслівыя імгненні. Успрымаючы з'явы прыроды, старажытны чалавек суадносіў іх са сваімі душэўнымі якасцямі, ідэаламі, ачалавечваў іх (дзяўчына – каліна, жанчына – вярба, хлопец – дуб). Анімізм (адушаўленне прыроды) – «у справах выхавання даваў добры плён, забяспечваў гуманныя адносіны да прыроды». Працягам гэтай традыцыі сёння можна лічыць **фарміраванне экалагічнага мыслення**. Такія аспекты дзейнасці ў галіне этнакультурнага выхавання як знаёмства з традыцыйнымі гульнямі, побытавым танцам і каляндарнымі спевамі каранёвай этнічнай традыцыі можа стаць спрыяльным «фактарам для лепшага ўсведамлення дзецьмі сваёй лучнасці з прыродай» [4, с. 115]. На погляд спецыялістаў (В.С. Болбаса, Н.В. Самерсавай, І.А. Валіева, Э.Ф. Маскалёва) этнакультурнае выхаванне спрые пераўтварэнню характэрных для сучаснага грамадства рацыянальных, утылітарна-практычных поглядаў на прыроду, на эмацыянальныя, эстэтычныя. А «эстэтычнае праяўляецца не ў прамым сэнсе спажывання, не ў выкарыстанні прадметаў, а ў іх успрыманні, любаванні, зачараванні імі» [5, с. 45].

Спецыфіка **маральнага выхвання** ў аматарскім фальклорным гурце заключана ў тым, што «выхаванне не адасабляецца ў спецыяльна арганізаваны працэс і што многія палажэнні народнай педагогікі ў несфармуляваным выглядзе ўтрымліваюцца» [4, с. 64] у народных песнях. Засвойваючы

народныя песні, дзеці аўтаматычна вучацца гуманнасці, дабрыні, памяркоўнасці, мяккасардэчнасці, добразычлівасці, шчырасці.

Спевы народных песень на роднай мове, вывучэнне традыцыйнай культуры свайго народа дапамагаюць фарміраваць любоў да свайго краю, мовы, гісторыі. Л.Л. Ражкова лічыць, што дзейнасць аматарскіх мастацкіх калектываў дазваляе комплексна выкарыстоўваць тры галоўныя складаючыя фарміравання **нацыянальнай самасвядомасці**:

1. набыццё і ўзбагачэнне нацыянальных ведаў;
2. узмацненне нацыянальных пачуццяў;
3. уключэнне асобы ў нацыянальныя па змесце віды дзейнасці [7, с. 3].

Заняткі ў фальклорных калектывах аказваюць станоўчы ўплыў на **фізічнае развіццё** дзяцей. Народныя гульні на вольным паветры разнявольваюць і знімаюць нервовае напружанне, спевы народных песень спрыяюць умацаванню глыбокага спеўнага дыхання.

Напрыканцы варта зрабіць наступныя высновы адносна эстэтыка-выхаваўчага ўплыву народнай песні на асобу дзіцяці ў фальклорным гурце.

1. Этнакультурнае выхаванне ў дзіцячым фальклорным гурце павінна быць пабудавана з улікам педагагічных функцый народнай творчасці (сацыялізацыя і інкультурацыя, эстэтычнае і экалагічнае выхаванне, маральнае і фізічнае развіццё, патрыятычнае выхаванне).
2. Вывучэнне народных твораў (песень) у фальклорных калектывах дапамагаюць фарміраваць любоў да свайго краю, мовы, гісторыі, далучаць дзяцей да культуры грамадства, фарміруюць яго эстэтычныя погляды, аказваюць уплыў на экалагічнае, маральнае, фізічнае, патрыятычнае развіццё дзяцей.

Спіс літаратуры:


1. Аляхновіч, А.М. Народная песня ў школе : дапам. для настаўнікаў музыкі і спеваў, кл. кіраўнікоў, выхавальнікаў / А.М. Аляхновіч. – Мн.: Беларусь, 2004. – 171с.
2. Арлова, Г.П. Беларуская народная педагогіка. / Г.П. Арлова. – Мн.: Нар. асвета, 1993. – 120 с.
3. Барташэвіч, Г.А. Сістэма жанраў беларускага дзіцячага фальклору / Г.А.Барташэвіч // Малыя жанры. Дзіцячы фальклор / пад рэд. А.С. Фядосік. – Мн.: Бел. навука, 2004. – С.369 – 381.
4. Болбас, В.С. Этычная педагогіка беларусаў / В.С.Болбас. – Мн.: Бел. навука, 2004. – 175 с.
5. Грыгаровіч, Я.Д. Эстэтычная накіраванасць асобы студэнта: педагагічны аспект / Я.Д. Грыгаровіч – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры, 2002. – 403 с.
6. Кухаронак, Т.І. Сацыяльна-педагагічны патэнцыял беларускіх свят і абрадаў : вучэб.-метад. дапам. / Т.І. Кухаронак, В.Г.Кухаронак. – Мн.: БДПУ, 2005. – 108с.
7. Ражкова, Л.Л., Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў сродкамі фальклору ў аматарскіх мастацкіх калектывах : аўтарэферат дыс. ... канд. пед. навук : 13.00.05 / Л.Л. Ражкова. – Мн., 2007. – 21 с.



***Сяргей Ярук***


# БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ ДУХАВЫЯ МУЗЫЧНЫЯ ІНСТРУМЕНТЫ Ў СУЧАСНАЙ ВЫКАНАЛЬНІЦКАЙ ПРАКТЫЦЫ

Сярод народных музычных інструментаў найбольш старажытнымі з'яўляюцца духавыя: *свістковыя* (дудкі розных строяў, парныя дудкі, поршневая дудка, акарына), *язычковыя* (жалейка, дуда, чаротка, саломка), *амбушурныя* (труба, рог). Яны да нядаўняга часу бытавалі сярод пастухоў, паляўнічых, музыкантаў-аматараў, але па прычыне змянення сацыяльных і вытворча-эканамічных умоў жыцця амаль зніклі. Вельмі плённа ў 70-80 гг. XX ст. з беларускімі народнымі духавымі інструментамі працавалі І. Лычкоўскі, У. Крайко, В. Пратасевіч, У. Пратасевіч, У. Пузыня. Зараз вядомы імёны наступных майстроў: В. Кульпін, А. Лось (мал. 1), Д. Гром, П. Саламенюк, А. Жукоўскі, А. Еўдакімаў, Ю. Скрамблевіч і іншыя [5, с. 3]. Але праблему буйнога тыражавання народнага інструментарыя намаганнямі гэтай групы энтузіястаў немагчыма вырашыць без стабільнай падтрымкі, у тым ліку – з боку дзяржавы. У той жа час беларускімі народнымі майстрамі ўжо сёння распрацаваны цэлыя сямейства дудак, жалеек, акарын, дуд, драўляных труб, маючых розны строй. У выніку стала магчымым выкарыстоўваць гэтыя інструменты амаль ва ўсіх танальнасцях і ў шырокім дыяпазоне [5, с. 4].

Дудка, дуда, жалейка – не зусім звыклыя інструменты сёння, але раней без іх удзелу не абыходзіліся народныя святы і абрады. Аднак, не ва ўсіх святах мог прымаць удзел выканаўца на той жа дудцы, які некалі наогул не лічыўся за музыку таму, што на гэтым інструменце пераважнаігралі пастухі (у народзе казалі: «Дзе пастухі, там і дудкі».). У лік музыкаў (калі не трэба было пасвіць хатнюю жывёлу) яны станавіліся падчас такіх свят, як Каляды, Вялікдзень, Радуніца, Купалле.